цвікоў, да якіх чапляліся кандытарскія вырабы. Ад цвікоў да цэнтра круга вялі намаляваныя крэйдай прамыя лініі, а вызначала прызы фанерная рука, якая была сціснутая ў кулак з выцягнутым уперад указальным пальцам. Удзельнік латарэя, які заплаціў загадзя абумоўленыя грошы, раскручваў фанерную руку, і калі яна спынялася дакладна на любой з ліній, атрымліваў у падарунак кандытарскі выраб, які быў падвешаны да цвіка гэтай лініі.

П. А. Гуд, Н. І. Гуд, Беларускі кірмаш
Запісала Л. Б. Каменева ў 1983 г. ад жыхара вёскі Тулаўшчына Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці У. А. Казловіча (1903 г. н.)

## Палескі прызавы слуп.



Палескі прызавы слуп меў свае канструктыўныя і тэхнічныя асаблівасці. Для гэтага атракцыёна выбіралася роўнаствольнае дрэва не менш як 16 м. Дрэва ашкурывалі, закапвалі ў зямлю, на канцы ўбівалі тоўсты, паўтараметровай даўжыні металічны драб, да якога мацавалі ў вертыкальным становішчы кола ад воза з прызамі. Удзельнік павінен быў залезці на самы спічак слупа, стаць на калена ці на ногі, ухапіўшыся за прут і варочаючы кола, выбраць сабе і адвязаць любы з прызоў.

Задача гульца была надзвычай складаная, тым не менш гэты атракцыён карыстаўся вялікай папулярнасцю і знаходзілася нямаа ахвотнікаў паказаць сваю смеласць,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**сілу, рашучасць і дабыць каштоўны прыз для сябе, ці сваёй каханай.**

П. А. Гуд, Н. І. Гуд, Беларускі кірмаш
Запісаў у 1979 г. П. А. Гуд у Століне ад М. І. Мельніка (1929 г. н.)

## Шчадруха.

Сучасны абрад шчадравання – гэта вясёлая гульня з песнямі, танцамі, інтэрмедыямі. Шчадравальшчыкі, апранутыя ў карнавальныя строі Дзеда Мароза, Снягурачкі, Зімы, Цыгана, Чорта, Мядзведзя, Лісы, Зайца, з крыкам і шумам ходзяць ад хаты да хаты. Падышоўшы да акна крайняй хаты, яна спяваюць:

Шчодровочка шчодровала,
До окэнца прыпадала,
Шчо ты, цітку, наварыла,
Што ты, цітку, напыкла,
Под окэнцэ прынысла,
Што я губы попыкла.

Пачуўшы віншавальныя прыпеўкі, людзі зазываюць шчадраўшчыкоў да сябе ў госці. Тыя заходзяць у хаты і звяртаюцца да гаспадароў:

Добры вечор, шчодрый вечор,
Добрым хозяевам добрае здароўе.

Затым яны пытаюць дазволу праспяваць песню:

Шчодры вечор, добры вечорі
Пану господару, пані господыні.
Кому пісню заспіваты,
Ваш дом звысылаты,
Кому? – Танечцы!

Спяваюць песню:

Ой, у Туровы, ды на муровы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ